*А.Г. КАХАНОЎСКІ*

# УЗРОВЕНЬ ПІСЬМЕННАСЦІ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XIX-XX ст.

На основе опубликованных материалов переписи 1897 г. проанализирован уровень грамотности населения Беларуси. Приведены сведения о степени образованности по основным сословным, конфессиональным и этническим группам населения. Обращено внимание на неоднородность распространения грамотности в Беларуси на региональном уровне в разрезе отдельных социальных, конфессиональных и этнических групп населения.

The level of literacy of the population of Belarus is analyzed on the basis of the published material of the census of 1897. The data on a degree of erudition of social, religious and ethnic groups of the population are presented. It focuses attention on the heterogeneous spread of literacy in Belarus on the regional level, taking into consideration separate social, confessional and ethic groups of the population.

Адукацыя і валоданне граматай ва ўмовах XIX ст. былі надзейнай асновай для прадстаўнікоў розных слаёў насельніцтва павысіць свой сацыяльны статус. Узровень пісьменнасці сведчыў аб ступені разгортвання мадэрнізацыйных працэсаў у XIX - пачатку XX ст., аб станаўленні буржуазнага грамадства. Пашырэнне адукацыі складала адзін з найбольш важных фактараў фарміравання грамадзянскай і этнічнай свядомасці розных сацыяльных груп насельніцтва, таксама несла пэўны прагматычны сэнс як сродак дасягнення лепшай долі, асабліва сярод сялянства.

У айчыннай літаратуры на розных этапах сустракаліся неадназначныя ацэнкі ўзроўню валодання граматай жыхарамі Беларусі. Доўгі час пераважаў павярхоўны аналіз, неабрунтаваныя і часта значна заніжаныя лічбы, што часткова было выклікана сцвярджэннем тэзіса аб каланіяльным мінулым Беларусі як былой адсталай ускраіны Расійскай імперыі. Першым грунтоўным даследаваннем названай праблемы стаў артыкул М.М. Улашчыка[1], у якім даследчык апрацаваў вялікую колькасць статыстычных дадзеных канца XIX - пачатку XX ст., асабліва апублікаваных матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г. Прыведзеныя М.М. Улашчыкам абагульняючыя лічбы аб узроўні пісьменнасці насельніцтва Беларусі канца XIX - пачатку XX ст. трывала ўвайшлі ў навуковы зварот многіх пазнейшых даследчыкаў і выкарыстоўваліся ў шэрагу навуковых прац і навучальных дапаможнікаў[2]. У асобных публікацыях[3] прыводзіліся сумарныя дадзеныя, заснаваныя на не зусім карэктных падліках, ці ўлічвалі рэгіён больш шырокі за тэрыторыю сучаснай Беларусі.

Інфармацыйныя магчымасці перапісу насельніцтва 1897 г. дазваляюць ахарактарызаваць не толькі агульны стан пісьменнасці жыхароў Беларусі на губернскім і павятовым узроўнях, але і прасачыць яго дынаміку па асобных узроставых трупах у дачыненні да саслоўных і канфесійных груп, а таксама адпаведна дадзеным аб роднай мове па этнасах, якія насяляюць тэрыторыю Беларусі. Апошнія аспекты абыдзены ўвагай у айчынных даследаваннях, але асобныя з іх прааналізаваны праз прызму нацыяўтваральных працэсаў у манаграфіі П.У. Церашковіча[4].

У нашым артыкуле разглядаюцца статыстычныя дадзеныя аб узроўні пісьменнасці насельніцтва Беларусі паводле апублікаваных матэрыялаў перапісу жыхароў Расійскай імперыі 1897 г. Выкарыстоўваемы ў артыкуле працэнт пісьменных з'яўляецца аб'ектыўным паказчыкам ступені адукаванасці, калі яна абмяжоўвалася ў XIX - пачатку XX ст. у пераважнай большасці выпадкаў валоданнем элементарнай граматы - умением чытаць і пісаць. У табл. 1 асобна вылучаны па кожнай з беларускіх губерняў* сумарныя колькасныя паказчыкі па паветах (сельскія населеныя пункты) і гарадах пісьменнага насельніцтва з размеркаваннем звестак па саслоўных трупах[5]. Для больш дакладнага ўяўлення аб працэсах, якія адбываліся ў межах сучаснай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дадзеныя ў табл. 1 прыведзены па 35 паветах. Пры падліках былі выключаны дзеці дашкольнага ўзросту (да 10 год), што дазваляе больш аб'ектыўна акрэс-

* Да ліку беларускіх губерняў аднесены (як гэта прынята ў айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі XIX - пачатку XX ст.) Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская, тэрыторыя якіх цалкам ці большай часткай уваходзіць у межы Рэспублікі Беларусь.

ліць ступень пашырэння пісьменнасці сярод насельніцтва Беларусі. У працэсе аналізу статыстычных звестак звернута ўвага на некаторыя недакладнасці, тэхнічныя памылкі матэрыялаў перапісу, якія парушаюць у пэўнай ступені карэктнасць апрацоўкі колькасных паказчыкаў. Напрыклад, у дадзеных па Полацкаму павету прыведзены лічбы пісьменных асоб сельскага стану, якія ў два - тры разы перавышаюць аналагічныя паказчыкі па іншых паветах Віцебскай губерні, выбіваюцца з лічбы агульнай колькасці пісьменных жыхароў на Полаччыне. Праз параўнальны аналіз супаставімых звестак па названаму павету ўдалося ўдакладніць дадзеныя аб узроўні пісьменнасці сельскага насельніцтва.

Табліца 1

**Удзельная вага пісьменнага насельніцтва па 35 паветах* Беларусі, %**

| Губерні | Удзельная вага пісьменнага насельніцтва | | | Пісьменныя па асноўных саслоўных групах | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | у тым ліку | | дваране і чыноўнікі | | | хрысціянскае духавенства | | | пачэсныя грамадзяне, мяшчане і інш. гарадскія саслоўі | | | сяляне | | |
| | | муж. | жан. | усяго | муж. | жан. | усяго | муж. | жан. | усяго | муж. | жан. | усяго | муж. | жан. |
| Віленская | 33,9 | 42,8 | 25,2 | 66,4 | 69,5 | 63,3 | 94,4 | 99,2 | 89,3 | 52,0 | 62,9 | 41,8 | 28,8 | 37,9 | 19,8 |
| па гарадах | 57,6 | 68,0 | 46,7 | 84,8 | 88,9 | 81,3 | 96,6 | 97,9 | 95,1 | 58,4 | 71,6 | 46,5 | 50,4 | 55,1 | 38,0 |
| па паветах | 32,9 | 41,6 | 24,3 | 65,2 | 68,4 | 62,1 | 94,1 | 99,4 | 88,5 | 50,4 | 60,8 | 40,7 | 28,5 | 37,6 | 19,7 |
| Віцебская | 25,2 | 34,3 | 16,1 | 79,2 | 88,6 | 71,5 | 94,7 | 98,8 | 91,3 | 52,0 | 63,0 | 42,0 | 15,1 | 24,6 | 14,8 |
| па гарадах | 56,8 | 68,2 | 45,5 | 94,2 | 96,5 | 92,0 | 96,5 | 99,1 | 92,8 | 57,2 | 69,7 | 46,3 | 46,2 | 58,7 | 25,1 |
| па паветах | 19,0 | 27,7 | 10,5 | 68,3 | 82,1 | 58,1 | 93,5 | 98,4 | 90,7 | 46,3 | 56,0 | 37,0 | 13,9 | 22,8 | 5,2 |
| Гродзенская | 33,1 | 46,5 | 19,1 | 91,5 | 92,4 | 90,9 | 96,0 | 99,2 | 92,9 | 57,2 | 70,0 | 45,8 | 25,2 | 39,7 | 9,5 |
| па гарадах | 59,6 | 67,7 | 49,2 | 95,7 | 96,8 | 95,2 | 94,1 | 100,0 | 88,5 | 57,1 | 68,9 | 46,4 | 57,5 | 61,8 | 39,2 |
| па паветах | 29,0 | 42,8 | 15,0 | 88,8 | 90,7 | 87,0 | 96,4 | 99,0 | 93,8 | 57,3 | 70,8 | 45,3 | 23,7 | 38,1 | 9,0 |
| Магілёўская | 23,3 | 35,3 | 11,3 | 71,8 | 78,5 | 65,6 | 90,4 | 98,3 | 84,4 | 50,8 | 64,9 | 38,1 | 15,1 | 27,4 | 3,2 |
| па гарадах | 56,2 | 68,4 | 44,5 | 95,0 | 97,1 | 93,0 | 96,3 | 99,6 | 93,0 | 56,8 | 71,2 | 43,9 | 43,9 | 55,1 | 24,3 |
| па паветах | 19,9 | 31,6 | 8,0 | 59,7 | 68,7 | 51,6 | 88,2 | 97,7 | 81,7 | 47,6 | 61,5 | 35,0 | 14,3 | 26,4 | 2,8 |
| Мінская | 23,8 | 34,1 | 13,5 | 63,9 | 74,2 | 53,0 | 92,0 | 97,9 | 87,0 | 47,8 | 62,1 | 34,0 | 13,5 | 22,7 | 4,3 |
| па гарадах | 55,5 | 66,0 | 45,5 | 86,9 | 91,0 | 83,2 | 96,2 | 99,0 | 92,1 | 54,7 | 67,6 | 43,5 | 46,3 | 53,5 | 29,2 |
| па паветах | 19,8 | 29,9 | 9,6 | 57,3 | 69,5 | 45,2 | 90,5 | 97,3 | 85,7 | 45,2 | 59,3 | 28,4 | 12,5 | 24,4 | 3,8 |

Найбольш высокі паказчык стану адукаванасці быў адзначаны сярод насельніцтва Віленскай губерні - 33,9 %, у тым ліку і сярод жаночай часткі жыхароў - 25,2 %. На другім месцы знаходзіцца Гродзенская губерня - 33,1 %, прычым самы высокі паказчык сярод мужчын - 46,5 %. Па астатніх губернях велічыня ўдзельнай вагі пісьменных жыхароў істотна не адрозніваецца: у Віцебскай - 25,2 %; у Мінскай - 23,8 %; у Магілёўскай - 23,3 %. Падлічаныя сумарныя паказчыкі аб удзельнай вазе пісьменнага насельніцтва па кожнай губерні некалькі адрозніваюцца ад дадзеных, прыведзеных у артыкуле М.М. Улашчыка: Віленская - 33,9 %; Віцебская - 27,1 %; Гродзенская - 31,5 %; Мінская - 22,7 %; Магілёўская - 21,8 %[6]. Паказальна, што сярод гарадскога насельніцтва беларускіх губерняў узровень пісьменнасці быў прыкладна аднолькавы (гл. табл. 1). Узровень пісьменнасці сельскіх жыхароў вылучаўся больш высокімі паказчыкамі ў Віленскай і Гродзенскай губернях, у астатніх ён быў дастаткова блізкі па сваіх колькасных характарыстыках.

Сярод саслоўных груп у Беларусі хрысціянскае духавенства вылучалася найбольшай удзельнай вагой пісьменных. Узровень адукаванасці святароў-мужчын па ўсіх без выключэння губернях набліжаўся да 100 %; некалькі ніжэй ён быў сярод жаночай часткі духоўнага саслоўя - ад 85 да 95 %, але гэты паказчык быў у сярэднім вышэй за астатнія сацыяльныя групы насельніцтва.

Дваране і чыноўнікі па стану авалодання граматай займалі другую пазіцыю пасля духавенства. Лічбавыя паказчыкі пісьменнасці дваран і чыноўнікаў па губернях вар'іравалі больш, чым у іншых саслоўных груп, за выключэннем сялянства (гл. табл. 1). Больш высокім узроўнем пісьменнасці вылучаліся прадстаўнікі вышэйшага саслоўя Гродзенскай (91,5 %) і Віцебскай (79,2 %) губерняў, нечакана нізкім - дваране і чыноўнікі Віленскай (66,4 %) і Мінскай (63,9 %) губерняў, што можна растлумачыць спецыфікай фарміравання дзяржаўнага апарату і ўра-

* Межы 35 паветаў у найбольшай ступені адпавядаюць рубяжам Рэспублікі Беларусь. Да іх ліку адносяцца ўсе паветы Магілёўскай і Мінскай губерняў; Ашмянскі, Вілейскі, Дзісненскі, Лідскі паветы Віленскай губерні; Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Полацкі паветы Віцебскай губерні; Брэсцкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Кобрынскі, Пружанскі, Слонімскі Гродзенскай губерні.

давай палітыкі ў беларускіх губернях у дзесяцігоддзі, наступныя пасля падаўлення паўстання 1863 г. Стан пісьменнасці пачэсных грамадзян, купцоў, мяшчан і прадстаўнікоў іншых гарадскіх саслоўяў зафіксаваны прыкладна аднароднымі лічбамі. Іх сярэднія паказчыкі па беларускіх губернях вар'іруюцца ў межах ад 57,2 % (Гродзенская губерня) да 47,8 % (Мінская губерня). Значна адрозніваўся стан пісьменнасці жаночай часткі гарадскіх саслоўяў: іх колькасныя паказчыкі вар'іраваліся ад 45,8 % у Гродзенскай губерні да 34 % - у Мінскай.

Прадстаўнікі сялянскага саслоўя, якія пражывалі ў гарадах, мелі ўзровень пісьменнасці амаль у два разы вышэй за сярэдні па Беларусі. Найбольш высокі паказчык быў зафіксаваны ў гарадах Гродзенскай губерні (57,5 %). Колькасныя суадносіны паміж пісьменнымі і непісьменнымі сялянкамі, жыўшымі ў гарадах і сельскай мясцовасці, адрозніваліся ў шмат разоў. У Мінскай губерні, напрыклад, удзельная вага пісьменных сялянак, жыўшых у гарадах, складала 29,2 %, а ў сельскай мясцовасці - 3,8 %. Розніца паміж меншым і большым паказчыкамі амаль васьмікратная; у Магілёўскай губерні яна была блізкай да дзевяцікратнай, у Віцебскай і Гродзенскай - амаль пяцікратнай і толькі ў Віленскай - двухкратная У мужчын-сялян такая характарыстыка была амаль двухкратнай з невялікім дыяпазонам варыяцыі значэнняў па губернях.

Табліца 2

**Узровень** пісьменнасці **насельніцтва** Беларусі па канфесійных г**рупах,** %

| Губерні | Праваслаўныя | | Каталікі | | Пратэстанты | | Іудзеі | | Мусульмане | | Старaабрадцы | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж. | жан. | муж. | жан. | муж. | жан. | муж. | жан. | муж. | жан. | муж. | жан. |
| Віленская | 29,0 | 8,3 | 33,5 | 26,7 | 76,3 | 75,8 | 54,3 | 35,0 | 41,5 | 38,2 | 16,8 | 2,5 |
| Віцебская | 21,0 | 5,5 | 37,1 | 41,4 | 64,0 | 62,7 | 53,5 | 35,3 | 34,8 | 35,7 | 20,8 | 3,8 |
| Гродзенская | 32,6 | 7,1 | 41,7 | 35,1 | 66,8 | 63,2 | 52,5 | 35,0 | 40,8 | 50,7 | 59,3 | 33,3 |
| Магілёўская | 21,1 | 3,7 | 40,1 | 28,4 | 64,1 | 56,7 | 54,2 | 34,1 | 34,1 | 20,0 | 25,6 | 5,4 |
| Мінская | 18,9 | 3,7 | 33,5 | 23,4 | 57,8 | 52,2 | 50,7 | 29,7 | 38,3 | 25,8 | 13,9 | 1,5 |

У табл. 2 дадзеныя падлічаны на аснове агульнагубернскіх звестак* без выключэння паветаў, якія знаходзяцца па-за сучаснымі межамі Беларусі, і дзяцей дашкольнага ўзросту[7]. Самы высокі паказчык адукаванасці быў характэрны для пратэстантаў, якім уласціва практычна роўная велічыня працэнта пісьменных для мужчын і жанчын. Найбольш высокая ўдзельная вага пісьменных была ў пратэстантаў Віленскай губерні (76,3 %), мінімальная - у Мінскай (57,8 %). Дастаткова значнымі паказчыкамі адукаванасці характарызаваліся іудзеі. Максімальнае і мінімальнае значэнні іх знаходзіліся ў дыяпазоне ад 54,3 % (Віленская губерня) да 50,7 % (Мінская губерня) у мужчын і ад 35,3 % (Віцебская губерня) да 29,7 % (Мінская губерня) у жанчын. У мусульман Беларусі ўдзельнага вага пісьменных вар'іравалася ў межах лічбавых паказчыкаў ад 41,5 % (Віленская губерня) да 34,1 % (Магілёўская губерня) сярод мужчын і ад 50,7 % (Гродзенская губерня) да 20 % (Магілёўская губерня) сярод жанчын. Працэнт пісьменных у каталікоў быў некалькі ніжэй, чым у названых вышэй канфесійных груп. У мужчын ён знаходзіўся ў межах ад 41,7 % (Гродзенская губерня) да 33,5 % (Віленская і Мінская губерні). Для каталічак характэрна большая дыстанцыя паміж максімальным і мінімальным паказчыкамі адукаванасці: 41,4 % (Віцебская губерня) і 23,4 % (Мінская). У самай шматлікай канфесійнай групы - праваслаўных дадзеныя аб узроўні адукаванасці значна вар'іруюцца. Істотна адрозніваўся працэнт пісьменных у мужчын і жанчын. Удзельная вага адукаваных сярод апошніх была ў тры - пяць разоў меншая, чым у мужчын-праваслаўных. Напрыклад, у Гродзенскай губерні паказчык пісьменнасці ў мужчын складаў 32,6 %, у жанчын - 7,1 %. Аналагічныя дадзеныя па Мінскай губерні, дзе назіраўся найменшы ўзровень пісьменнасці праваслаўных, былі зафіксаваны ў наступных межах: адпаведна 18,9 і 3,7 %. Самым нізкім узроўнем пісьменнасці вызначаліся

* Дадзеныя, прыведзеныя ў табліцы XIV апублікаваных пагубернскіх матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г., не дазваляюць вылучыць асобна звесткі аб дзецях дашкольнага ўзросту. Акрамя таго, выкарыстанне абагульняючых дадзеных па губерні. без выдзялення інфармацыі па беларускіх паветах, істотна не ўплывае на выніку параўнальнага аналізу ступені пісьменнасці прадстаўнікоў канфесіянальных груп.

стараабрадцы, асабліва жанчыны гэтай канфесіі. Выключэнне складае Гродзенская губерня, дзе адзначаны вельмі высокі паказчык адукаванасці: 59,3 % - у мужчын і 33,3 % - у жанчын. Ва ўсіх астатніх губернях удзельная вага пісьменных стараабрадцаў знаходзілася ў межах паміж 25,6 % (Магілёўская губерня) і 13,9 % (Мінская губерня) у мужчын; 5,4 % (Магілёўская губерня) і 1,5 % (Мінская губерня) у жанчын.

Табліца 3

**Узровень пісьменнасці насельніцтва Беларусі адпаведна дадзеным аб роднай мове, %**

| Губерні | Беларуская | | Руская | | Польская | | Яўрэйская | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | у тым ліку атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай | усяго | у тым ліку атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай | усяго | у тым ліку атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай | усяго | у тым ліку атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай |
| Віленская | 34,0 | 6,6 | 37,6 | 33,1 | 55,9 | 11,3 | 59,8 | 1,4 |
| па гарадах | 46,3 | 8,7 | 48,7 | 45,3 | 92,8 | 15,6 | 64,8 | 2,5 |
| па паветах | 33,8 | 6,5 | 27,4 | 13,2 | 50,9 | 2,6 | 57,2 | 0,6 |
| Віцебская | 22,7 | 0,7 | 27,2 | 16,4 | 55,9 | 6,5 | 57,6 | 1,8 |
| па гарадах | 55,2 | 7,5 | 42,3 | 48,0 | 59,7 | 16,6 | 57,8 | 2,6 |
| па паветах | 21,7 | 0,2 | 22,7 | 1,3 | 54,0 | 1,1 | 58,1 | 0,1 |
| Гродзенская | 37,4 | 0,5 | 60,1 | 22,9 | 55,3 | 2,8 | 56,5 | 0,8 |
| па гарадах | 57,4 | 5,6 | 62,3 | 32,1 | 64,3 | 11,0 | 56,7 | 1,4 |
| па паветах | 36,9 | 0,3 | 56,9 | 11,9 | 53,3 | 0,6 | 56,3 | 0 |
| Магілёўская | 23,6 | 1,1 | 32,7 | 45,6 | 49,1 | 17,4 | 60,1 | 1,3 |
| па гарадах | 53,8 | 12,6 | 43,2 | 88,7 | 54,3 | 64,3 | 61,7 | 3,2 |
| па паветах | 22,6 | 0,2 | 31,2 | 4,2 | 47,7 | 2,9 | 59,2 | 0,1 |
| Мінская | 18,6 | 0,7 | 38,2 | 32,6 | 50,4 | 10,5 | 53,0 | 0,8 |
| па гарадах | 51,5 | 7,1 | 51,1 | 44,9 | 61,8 | 31,0 | 55,5 | 1,8 |
| па паветах | 18,3 | 0,5 | 25,6 | 8,5 | 38,4 | 1,9 | 51,3 | 0,1 |

У табл. 3 прыведзены дадзеныя аб узроўні пісьменнасці прадстаўнікоў асноўных этнічных груп насельніцтва Беларусі адпаведна звесткам аб іх роднай мове[8]. Дадзеныя перапісу 1897 г. аб роднай мове жыхароў у параўнанні з іншымі крыніцамі таго часу даюць больш аб'ектыўную інфармацыю, паводле якой можна меркаваць аб нацыянальным складзе насельніцтва Беларусі. Распрацоўка табліц аб роднай мове адпавядала міжнародным стандартам таго часу, і гэты паказчык выкарыстоўваўся пры правядзенні дэмаграфічных абследаванняў у еўрапейскіх краінах. Названы паказчык у этнапалітычных умовах на мяжы XIX-XX ст. у значнай ступені сведчыў аб кірунку развіцця нацыянальнай самасвядомасці жыхароў Беларусі, характары этналінгвістычнай сітуацыі ў той час. У табл. 3 прыведзены звесткі ў межах кожнай з беларускіх губерняў (асобна па гарадах і па паветах) з размеркаваннем іх па найбольш шматлікіх этналінгвістычных трупах. У табліцы ўведзены таксама паказчык, які фіксуе працэнт насельніцтва, атрымаўшага адукацыю вышэй пачатковай, у суадносінах да агульнай колькасці пісьменных жыхароў той ці іншай этналінгвістычнай групы. Гэты паказчык адлюстроўвае якасць і ўзровень набытай адукацыі. У разглядаемай табліцы змешчаны звесткі па маладых людзях асобнай узроставай групы 10-19 гг., якая мабільна адлюстроўвала дынаміку ў структуры адукацыі на мяжы XIX-XX ст. Вышэйшы ўзровень адукаванасці, адпаведна дадзеным, прыведзеным у табліцы, быў характэрны для маладых людзей, якія абазначылі ў якасці сваёй роднай мовы рускую і польскую, прычым носьбіты першай мелі больш высокі працэнт пісьменнасці (з улікам двух паказчыкаў, прыведзеных у табліцы) па Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях. Стан адукаванасці прадстаўнікоў яўрэйскай этналінгвістычнай групы рэгіянальна характарызуецца прыкладна аднароднымі колькаснымі паказчыкамі: нізкай удзельнай вагой асоб, атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай, пры высокім узроўні валодання элементарнай граматай адносна іншых груп. Для маладых асоб, якія абазначылі родней беларускую мову, быў характэрны нізкі адносна іншых этналінгвістычных груп агульны працэнт пісьменных, хаця ён і вышэй сярэдніх выніковых дадзеных аб стане адукаванасці, прыведзеных па губернях у табл. 1. Узровень пісьменнасці маладых людзей і іншых этналінгвістычных груп быў вышэй сярэдняга ў жыхароў беларускіх губерняў. Найбольш адукаванымі беларусы былі ў Віленскай і Гродзенскай губернях і гарадах Магілёўскай і Мінскай губерняў. Для іх характэрна вялікая дыстанцыя ў максімальных і мінімальных паказчыках агульнай пісьмен-

насці і працэнта атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай. Па апошняму паказчыку, напрыклад, мінімальнае значэнне зафіксавана ў Мінскай губерні (0,7 %), максімальнае - у Віленскай (6,6 %). Значна вар'іравалася лічба ўдзельнай вагі асоб, атрымаўшых адукацыю вышэй пачатковай, таксама і ў прадстаўнікоў рускай і польскай этналінгвістычных груп.

Пераважна на аснове дадзеных перапісу, а таксама з прыцягненнем асобных звестак фабрычна-заводскай статыстыкі канца XIX ст. была сфарміравана сістэма колькасных паказчыкаў, якія характарызуюць сацыяльную структуру насельніцтва Беларусі на мяжы XIX-XX ст. і якасныя змены ў яе эвалюцыі. Сярод вылучаных прыкмет - удзельная вага пісьменнага насельніцтва. Пры дапамозе рэгрэсійнага аналізу зроблена спроба выявіць сувязі кожнага з паказчыкаў, абраных у якасці выніковых (залежных), адначасова з некалькімі іншымі (фактарныя паказчыкі) і гэтыя сувязі ранжыраваць па ступені праяўлення. Узаемасувязі паміж паказчыкамі ў рэгрэсійных мадэлях адлюстроўваюць рэальныя змены, эвалюцыю сацыяльных груп насельніцтва Беларусі на павятовым узроўні. У адной з атрыманых мадэляў у якасці выніковага паказчыка выступае індыкатар узроўню пісьменнасці насельніцтва. Фактарнымі прыкметамі ў ёй з'яўляюцца наступныя характарыстыкі: удзельная вага насельніцтва, якое мела самастойныя заняткі; сельскагаспадарчых жыхароў, занятых неземляробчымі промысламі; доля занятых прыватнай службай, прыслугі, падзёншчыкаў, а таксама фабрычна-заводскіх рабочых, чыноўнікаў і ваеннаслужачых. Варыяцыя значэнняў выніковага паказчыка (долі пісьменнага насельніцтва) па паветах Беларусі на 82,5 % была сінхроннай зменам велічыні фактарных характарыстык. У разгледжанай мадэлі сувязі прама прапарцыянальныя. Павялічванне па паветах на адзінку долі насельніцтва, якое мела самастойныя заняткі, суправаджалася ростам удзельнай вагі пісьменных жыхароў на 0,7 адзінкі; аналагічнае ўзрастанне працэнта сельскагаспадарчага насельніцтва, занятага неземляробчымі промысламі, спадарожнічала ўздыму пісьменнасці жыхароў на 0,14 адзінкі; рост долі асоб, занятых прыватнай службай, прыслугі, падзёншчыкаў адпаведна на 1,34; фабрычна-заводскіх рабочых - на 0,28; чыноўнікаў і ваеннаслужачых - на 0,21 адзінкі.

Прааналізаваны статыстычны матэрыял пераканаўча сведчыць аб неаднароднасці і неадназначнасці працэсу пашырэння пісьменнасці сярод жыхароў Беларусі на рэгіянальным узроўні, па асобных сацыяльных, канфесійных і этналінгвістычных трупах. У артыкуле зроблены статычны зрэз сітуацыі на мяжы XIX - XX ст. фактычна на аснове адной крыніцы, але прыведзеныя дадзеныя не вычэрпваюць інфармацыйных магчымасцей дэмаграфічнага абследавання 1897 г. Акрамя таго, ёсць неабходнасць грунтоўнага вывучэння дынамікі ўзроўню і якасці пісьменнасці насельніцтва Беларусі ў канцы XIX - пачатку XX ст., перш за ўсё на мікраўзроўні, паколькі прысутнічае аб'ектыўная складанасць з наяўнасцю супаставімых статыстычных крыніц.

1 Гл.: Улащик Н.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1. С. 106-116.

2 Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861-1917 гг.). Мн., 1972. С. 200; Снапкоўская С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX - пачатку XX ст. Мн., 1988. С. 25; Пісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917 г.: Вучэбны дапаможнік. Мн., 2001. С. 239; Пісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII - пачатак XX ст.). Мн., 2005. С. 279.

3 Гл.: Асвета і педагагічная думка ў Беларусі ад старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1984. С. 337.

4 Гл.: Терешкович П.В. Этническая история Беларуси XIX - начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы. Мн., 2004. С. 148-151.

5 Падлічана паводле дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Под ред. Н. Тройницкого. СПб., 1903. Вып. IV. Виленская губерния. Тетрадь 3. Табл. IX; СПб., 1903. Вып. V. Витебская губерния. Тетрадь 3. Табл. IX; СПб., 1903. Вып. XI. Гродненская губерния. Табл. IX; СПб., 1904. Вып. XXII. Минская губерния. Табл. IX; СПб., 1903. Вып. XXIII. Могилевская губерния. Табл. IX.

6 Гл.: Улащик Н.Н. Указ. сач. С. 109.

7 Падлічана паводле дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи... Вып. IV, V, XI, XXII, XXIII. Табл. XIV.

8 Падлічана паводле дадзеных: Первая всеобщая перепись населения Российской империи... Вып. IV, V, XI, XXII , XXIII. Табл. XV.

Паступіў у рэдакцыю 08.02.06.

***Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі*** - кандидат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.